

Да арт. **Мсціслаўскае шкло.** Фрагмент размаляванага посуду. 18 ст. (злева); выява герба мсціслаўскага феадала. 17 ст.

лямі. Куфлі шара- і грушападобныя, канічныя, цыліндрычныя, з ручкамі, дэкаратыўна выгнутымі з трох жгутоў. Большасць куфляў мела звужэнне над акруглым донцам, вышэй якога сценкі рэзка пашыраліся вонкі. Чаркі выдзімалі конусападобныя, цыліндрычныя, з прафіляванымі сценкамі. Бутлі шарападобныя і цыліндрычныя, фармаваныя адвольна, з разнастайнымі формамі рыльцаў. Пляшкі шарападобныя і біканічныя, з авальнымі паддонамі, утворанымі адзінарнымі гладкімі або хваліста ўкладзенымі стужкамі. Шкляніцы адвольна выдзіманыя, канічныя, шарападобныя, цыліндрычныя, з паддонамі розных канфігурацый. Кубкі пераважна званападобныя, без паддонаў, з адагнутымі вонкі венчыкамі, а таксама конусападобныя. Бакалы 18—19 ст. з адвольна выдзіманымі лейкападобнымі чашамі на вальцаваных (стрыжне- і балясінападобных) і выдзіманых балясінападобных ножках з круглымі падножжамі. Аконнае шкло ў 17 ст. выдзімалі ў выглядзе круглых шыбак-дыскаў, у 18—19 ст.— прамавугольных шыбак.

*Літ.:* Я н і ц к а я М. М. Вытокі шклароства Беларусі.— Мн., 1980; я е ж. Беларускае мастацкае шкло (XVI—XVIII стст.).— Мн., 1977; я е ж. Беларускае мастацкае шкло. XIX — пачатак XX ст.— Мн., 1984; Шклароства.— У кн.: Промыслы і рамёствы Беларусі. Мн., 1984; Я н і ц к а я М. М., С т а ш к е в і ч А. Б. Мсціслаўскае шкло XVI—XIX стст.— У кн.: Помнікі культуры. Новыя адкрыцці. Мн., 1985.

*А. Б. Сташкевіч, А. А. Трусаў, М. М. Яніцкая.*

**МСЦІСЛА́ЎСКАЯ КА́ФЛЯ**, архітэктурна-дэкаратыўная кераміка 15—18 ст. з Мсціслава. Кафля 15—16 ст. гаршковая з крыжападобным (15 — пач. 16 ст.), квадратным (1-я пал.— сярэдзіна 16 ст.) і круглым (канец 15—16 і, магчыма, 17 ст.) вусцем. Кафля 16—18 ст. каробчатая — тэракотавая і паліваная (паліхромная і размаляваная) пакрытая зялёнай, светла- і цёмнакарычневай палівай. Тэракотавая кафля 1-й пал. 16 ст. мае рэльефную вонкавую пласціну без рамкі. Кафля ў канцы 16 — 1-й пал. 17 ст. была паліхромная (пераважалі зялёны, сіні і белы колеры) з 2-прыступкавай рамкай і раслінным арнаментам на вонкавай пласціне. У сярэдзіне — 3-й чвэрці 17 ст. мела рамку па краі вонкавай пласціны, багата аздаблялася раслінным арнаментам, у 2-й пал.— канцы 17 ст. была без рамкі, аздоблена барэльефным дывановым арнаментам, з канца 17 — 1-й пал. 18 ст. была без рамкі, з тоўстай вонкавай пласцінай вял. памераў, упрыгожанай раслінным або геральдычным арнаментам (высокі рэльеф). У кафлі 2-й пал. 18 ст. малюнак на вонкавай пласціне адсутнічае, румпа мае вышыню 7—8 см. Паводле прызначэння М. к. падзяляецца на сценную, карнізную (простую, складаную і вуглавую), паясную, каронкі (гарадкі). У аздабленні пашыраны раслінны (выявы букета кветак у вазе), геральдычны (выявы гербаў і манаграм уладароў, герба Мсціслава), геаметрычны (рыбіна луска, рамбічныя сеткі, кропкі, кругі і інш.), зааморфны (выявы птушак, ільвоў, грыфонаў і інш.), сюжэтны (выявы конніка, Юрыя-пераможцы, воіна з шабляй у руцэ і інш.) арнаменты. У 2-й пал. 17 ст. мсціслаўскія цаніннікі (найб. вядомы *Палубес*) працавалі ў Маск. дзяржаве, дзе выраблялі арх. кафлю. Іл. гл. таксама на ўкл. да арт. *Кафля.* *А. А. Трусаў.*



Мсціслаўская кафля. 17 ст.

**МСЦІСЛА́ЎСКАЯ КЕРА́МІКА**, вырабы мясцовых ганчароў 12—19 ст. з Мсціслава. У 12—13 ст. выраблялі гаршкі з канаўкай на ўнутр. паверхні, аздобленыя на плечуках хвалістым арнаментам, насечкамі і наколкамі (дэкор захоўваўся да 15 ст.). Посуд 12—15 ст. меў на донцах клеймы ў выглядзе крыжоў, кругоў,



Мсціслаўская кераміка. Фрагменты размаляванага паліванага посуду. 2-я пал. 17—1-я пал. 18 ст.